# Советы і соцыялістычнае спаборніцтва

В. І. КАЗЛОЎ

Савецкі народ, ператвараючы ў жыццё сталінскую праграму будаўніцтва комунізма, паспяхова выканаў план першай пасляваеннай пяцігодкі і атрымаў у 1951 годзе і ў першым квартале бягучага года новыя бліскучыя перамогі ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Высокімі тэмпамі развіваецца прамысловасць нашай краіны. Дасягнуты вялікія поспехі ў пасляваенны перыяд у сельскай гаспадарцы і ў іншых галінах народнай гаспадаркі на базе ўкаранення перадавой савецкай тэхнікі і росту прадукцыйнасці працы. Савецкія людзі з небывалым у гісторыі творчым энтузіязмам узводзяць грандыёзныя электрастанцыі, каналы і арашальныя сістэмы, якія з'яўляюцца новым, буйным укладам у вялікую справу стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы комунізма.

Дасягнутыя ў нашай краіне поспехі ва ўсіх важнейшых галінах народнай гаспадаркі забяспечваюць няўхільнае павышэнне матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця савецкага народа. Бесперапынны рост нацыянальнага даходу на аснове магутнага ўздыму соцыялістычнай эканомікі СССР дазволілі праводзіць палітыку зніжэння цэн на тавары масавага спажывання, павышаць рэальную зарплату рабочых і служачых, а таксама даходы сялян, павялічваць продаж тавараў насельніцтву.

З кожным годам яшчэ больш расце і мацнее магутнасць савецкай дзяржавы, якая нястомна змагаецца за трывалы і працяглы мір ва ўсім свеце, за ўмацаванне дружбы паміж народамі. Велізарныя поспехі савецкай дзяржавы, яе паслядоўная мірная знешняя палітыка высока ўзнялі аўтарытэт і міжнародны ўплыў Савецкага Саюза, на прыкладзе якога народы ўсіх краін пераконваюцца ў перавагах соцыялістычнага ладу над капіталістычным.

Савецкі народ, натхнёны вялікімі ідэямі партыі Леніна — Сталіна, разгарнуў свае творчыя здольнасці і, з'яўляючыся актыўнай стваральнай сілай соцыялістычнага грамадства, дзейсна ўдзельнічае ва ўсенародным соцыялістычным спаборніцтве за далейшае развіццё эканомікі СССР, за новыя поспехі савецкай навукі, тэхнікі і культуры, з любоўю аддаючы свае сілы, энергію і веды справе будаўніцтва комунізма.

Беларускі народ разам з усім савецкім народам змагаецца за далейшы ўздым соцыялістычнай эканомікі і культуры, за датэрміновае выкананне дзяржаўнага плана 1952 года ўсімі галінамі народнай гаспадаркі, за ўцягненне ў гэтую высакародную справу ўсіх працоўных. Усе нашы савецкія органы і іх работнікі пад кіраўнцтвам ЦК КП(б)Б і мясцовых партарганізацый абавязаны яшчэ больш настойліва і энергічна арганізоўваць і накіроўваць барацьбу беларускага народа на павышэнне прадукцыйнасці працы, больш праяўляць ініцыятывы ў барацьбе за выпуск прадукцыі высокай якасці, зніжэнне сабекошту, за эканомію сыравіны і матэрыялаў, забяспечыць смелае авалоданне нашымі кадрамі новай тэхнікай і перадавымі метадамі працы.

Абавязак партыйных і савецкіх органаў, работнікаў МТС і соўгасаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі і ўсіх калгаснікаў нястомна змагацца за павышэнне ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур, за ўся-

мернае развіццё грамадскай жывёлагадоўлі і рост яе прадуктыўнасці, за шырокае ўкараненне ў калгасную і соўгасную вытворчасць дасягненняў агранамічнай навукі і перадавога вопыту, за далейшае ўмацаванне і ўсебаковае развіццё грамадскай гаспадаркі калгасаў.

Задача заключаецца ў тым, каб арганізаваць і настойліва рухаць уперад совецкую навуку і тэхніку, накіроўваць творчыя сілы і здольнасці совецкіх людзей на новы ўздым соцыялістычнай культуры, народнай адукацыі і аховы здароўя, пастаянна клапаціцца аб росце культурнага і тэхнічнага ўзроўню працоўных, іх палітычнай і вытворчай актыўнасці.

VIII пленум Цэнтральнага Камітэта Компартыі большэвікоў Беларусі, які адбыўся ў студзені бягучага года, падвёў вынікі работы партыйных, совецкіх і сельскагаспадарчых органаў рэспублікі за 1951 год у галіне сельскай гаспадаркі і намеціў шырокую праграму барацьбы за высокі ўраджай усіх сельскагаспадарчых культур і ўздым грамадскай жывёлагадоўлі ў 1952 годзе.

У мінулым годзе ў рэспубліцы праароблена значная работа па далейшаму развіццю соцыялістычнага земляробства і жывёлагадоўлі, па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў і ўздыму іх грамадскага багацця. Расшыраны пасеўныя плошчы, перавыканан дзяржаўны план асушэння балот і забалочаных зямель, значна больш, чым у мінулым годзе, ўнесена ў глебу ўгнаенняў.

Больш удзялялася ўвагі павышэнню якасці палявых работ. Рад калгасаў і соўгасаў рэспублікі пры неспрыяльных кліматычных умовах мінулага года дабіўся высокіх ураджаяў. У калгасах і соўгасах павялічылася пагалоўе грамадскай жывёлы, расшырылася кармавая база.

Калгасы і соўгасы рэспублікі датэрмінова выканалі дзяржаўны план хлебанарыхтовак, перавыканалі план здачы сена, насення кок-сагызу і значна павялічылі здачу дзяржаве карэнняў кок-сагызу і прадуктаў жывёлагадоўлі.

Дзякуючы нястомным клопатам партыі і ўрада, асабіста таварыша Сталіна аб уздыме сельскай гаспадаркі Беларусі з года ў год расце матэрыяльна-тэхнічная аснашчонасць нашых калгасаў, соўгасаў, МТС.

У 1951 годзе сельская гаспадарка рэспублікі атрымала вялікую колькасць трактараў, камбайнаў, сеялак, культыватараў, ільнокамбайнаў, ільноцерабілак і іншых машын і прычэпных прылад. У рэспубліцы створана 10 машынна-меліяратыўных станцый і 100 машынна-меліяратыўных атрадаў пры МТС.

Рост тэхнічнай узброенасці дазволіў яшчэ больш механізаваць сельскагаспадарчыя работы ў калгасах. Аб'ём сельскагаспадарчых работ, выкананых МТС у калгасах, павялічыўся на 36 процантаў у параўнанні з 1950 годам.

Праведзеная за тры гады велізарная работа па развіццю грамадскай жывёлагадоўлі дала магчымасць не толькі поўнасцю аднавіць агульны ўзровень пагалоўя жывёлы, якое было ў рэспубліцы да вайны, але і значна яго пераўзыйсці па буйнай рагатай жывёле, свіннях, авечках і козах. Праароблена таксама вялікая работа па будаўніцтву жывёлагадоўчых памяшканняў у калгасах.

Усё гэта вельмі ярка сведчыць аб тым, што беларускі народ пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна, пры нястомнай дапамозе Саюзнага ўрада і асабіста таварыша Сталіна, паспяхова ліквідаваў вынікі вайны

Узбуйненне калгасаў і завяршэнне ў асноўным калектывізацыі сялянскіх гаспадарак у заходніх абласцях стварылі спрыяльныя ўмовы для паспяховага ўздыму сельскай гаспадаркі рэспублікі.

VIII пленум Цэнтральнага Камітэта Компартыі большэвікоў Беларусі распрацаваў і намеціў канкрэтныя мерапрыемствы, накіраваныя на

далейшае і ўсебаковае развіццё сельскай гаспадаркі і абавязаў партыйныя, совецкія і сельскагаспадарчыя органы, дырэктараў МТС і соўгасаў, старшынь калгасаў сканцэнтраваць у 1952 годзе ўсе сілы і сродкі калгасаў, МТС і соўгасаў на вырашэнні галоўнай задачы ў сельскай гаспадарцы, пастаўленай Цэнтральным Камітэтам ВКП(б) і Урадам Саюза ССР — усямернае павышэнне ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур і развіццё грамадскай жывёлагадоўлі пры адначасовым значным павышэнні яе прадуктыўнасці.

У выкананні гэтай галоўнай задачы велізарную ролю павінны адыграць мясцовыя Советы. Важнейшая задача совецкіх работнікаў заключаецца ў тым, каб забяспечыць у 1952 годзе безумоўнае выкананне і перавыкананне кожным калгасам, МТС і соўгасам устаноўленых дзяржаўных заданняў па пасеўных плошчах, па ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур і росту грамадскага пагалоўя жывёлы.

Магутным сродкам мабілізацыі працоўных на паспяховае выкананне дзяржаўных планавых заданняў з'яўляецца ўсенароднае соцыялістычнае спаборніцтва. Яно прадстаўляе сабой комуністычны метад будаўніцтва. Соцыялістычнае спаборніцтва валодае невычарпальнай жыццёвай сілай, таму што яно ўзнікла ў выніку перамогі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, узняўшай народы нашай Радзімы да натхнёнай творчасці, нястомнага будаўніцтва, смелага наватарства, таму што яго арганізоўвае і накіроўвае вялікая партыя Леніна — Сталіна.

Наш соцыялістычны лад, наша совецкая сістэма гаспадаркі раскрылі нябачаныя прасторы для творчай дзейнасці народных мас. На ўсіх этапах будаўніцтва соцыялізма партыя Леніна — Сталіна надавала велізарнае значэнне разгортванню соцыялістычнага спаборніцтва, выхоўвала ў масах працоўных свядомыя адносіны да працы, да справы грамадскай важнасці, да справы, ад якой залежыць магутнасць нашай краіны і дабрабыт усяго народа. Соцыялістычнае спаборніцтва ў нашай краіне стала масавым, усенародным, увайшло ў плоць і кроў совецкіх людзей.

«Соцыялізм, — пісаў В. І. Ленін яшчэ ў 1917 годзе ў артыкуле «Як арганізаваць спаборніцтва», — не толькі не аслабляе спаборніцтва, а наадварот, упершыню стварае магчымасць прымяніць яго сапраўды **шырока,** сапраўды ў **масавым** размеры, уцягнуць сапраўды большасць працоўных на арэну такой работы, дзе яны могуць праявіць сябе, разгарнуць свае здольнасці, выявіць таленты, якіх у народзе — непачатая крыніца...». (Творы, т. 26, стар. 367).

В. І. Ленін адкрыў соцыялістычнае спаборніцтва як новую, нябачаную раней у гісторыі грамадства форму масавага ўцягнення працоўных у дзяржаўнае, эканамічнае і культурнае будаўніцтва, як магутны сродак бесперапыннага ўздыму працоўнай актыўнасці мас, усебаковага развіцця творчых здольнасцей і талентаў народа, як метад будаўніцтва новага комуністычнага грамадства.

Развіваючы ідэі Леніна аб соцыялістычным спаборніцтве, таварыш Сталін указаў, што спаборніцтва — гэта **«комуністычны метад будаўніцтва соцыялізма** на аснове максімальнай **актыўнасці** мільённых мас працоўных... спаборніцтва ёсць той **рычаг,** пры дапамозе якога рабочы клас заклікан перавярнуць ўсё гаспадарчае і культурнае жыццё краіны на базе соцыялізма» (І. Сталін. Творы, т. 12, стар. 109).

Указанні Леніна і Сталіна аб ролі і значэнні творчай ініцыятывы мас на усіх этапах развіцця соцыялістычнага будаўніцтва ўносілі і ўносяць у асяроддзе працоўных комуністычную свядомасць. Гэтыя указанні даюць масам яснасць перспектывы развіцця і павялічваюць іх

энергію ў барацьбе за ўсебаковае развіццё прадукцыйных сіл, здольных забяспечыць комуністычнае будаўніцтва.

Комуністычны метад социялістычнага будаўніцтва, выпрацаваны рабочым класам СССР пад непасрэдным кіраўніцтвам вялікіх правадыроў нашага народа Леніна і Сталіна, дзякуючы нястомнай арганізатарскай і ідэйна-палітычнай рабоце большэвіцкай партыіі стаў здабыткам шырокіх мас калгаснага сялянства. Пасляхова прымяняючы, удасканальваючы гэты метад, калгаснікі ўнеслі ў скарбніцу стаханаўскага вопыту многа каштоўных пачынанняў, якія з поспехам прымяняюцца ў сельскай гаспадарцы і маюць вялікае народнагаспадарчае значэнне.

Наша сельская гаспадарка, перабудаваная на базе социялістычнай калгаснай вытворчасці, расла і ўмацоўвалася побач з ростам социялістычнай індустрыі. Яна ўзброілася сучаснай тэхнікай і передавой навукай. Па насычанасці новай тэхнікай социялістычнае земляробства стала самым буйным і найбольш механізаваным у свеце, а сельскагаспадарчая праца з кожным годам усё больш ператвараецца ў рознавіднасць працы індустрыяльнай.

Калгасны лад змяніў у корані прыроду сялянства. У дакладзе на Надзвычайным VIII Усесаюзным з'ездзе Советаў у 1936 годзе таварыш Сталін гаварыў:

«Наша совецкае сялянства з'яўляецца зусім новым сялянствам... наша совецкае сялянства ў сваёй пераважаючай большасці ёсць калгаснае сялянства, г. зн. яно базіруе сваю работу і свой здабытак не на аднаасобнай працы і адсталай тэхніцы, а на калектыўнай працы і сучаснай тэхніцы. Урэшце, у аснове гаспадаркі нашага сялянства ляжыць не прыватная ўласнасць, а калектыўная ўласнасць, якая вырасла на базе калектыўнай працы.

Як бачыце, совецкае сялянства — гэта зусім новае сялянства, падобнага якому яшчэ не ведала гісторыя чалавецтва» («Пытанні ленінізма», выд. 11, стар. 511—512).

З перамогай калгаснага ладу ў вёсцы пачало разгортвацца ў масавым маштабе социялістычнае спаборніцтва. У сельскай гаспадарцы растуць і павялічваюцца рады стаханаўцаў — майстраў высокіх ураджаяў. У сельскай гаспадарцы, як і ў прамысловасці, стаханаўцы ламаюць устарэлыя нормы выпрацоўкі, паказваюць высокую арганізацыю і прадукцыйнасць працы.

Социялістычная праца і высокая ступень механізацыі зрабілі наша земляробства высокапрадукцыйным. Сотні тысяч сялян сталі механікамі, трактарыстамі, камбайнерамі, шоферамі, вывучылі многія складаныя сельскагаспадарчыя машыны і, умела выкарыстоўваючы іх, не толькі самі вызваліліся ад цяжкай знясіляючай працы, але і вызвалілі ад гэтай цяжкай працы іншых калгаснікаў. Усё гэта стала магчымым дзякуючы ажыццяўленню палітыкі социялістычнай індустрыялізацыі краіны, перамозе калгаснага ладу і працоўнай актыўнасці калгаснага сялянства.

Пасля пераможнага скончэння Вялікай Айчыннай вайны таварыш Сталін паставіў перад совецкім народам новыя грандыёзныя задачы аднаўлення і далейшага развіцця ўсёй народнай гаспадаркі краіны, якія натхнілі рабочых, сялян і інтэлігенцыю на новы працоўны ўздым, на яшчэ больш шырокае разгортванне социялістычнага спаборніцтва.

У пасляваенны перыяд социялістычнае спаборніцтва набыло сапраўды ўсенародны характар і ахапіла ўсе галіны народнай гаспадаркі.

Выдатную ролю ў развіцці спаборніцтва ў калгаснай вёсцы ў пасляваенны перыяд адыгралі рашэнні лютаўскага пленума ЦК ВКП(б), пастанова Совета Міністраў Саюза ССР ад 19 красавіка 1948 года «Аб мерах па паляпшэнню арганізацыі, павышэнню прадукцыйнасці і ўпа-

радкаванню аплаты працы ў калгасах» і прынятыя па прапанове таварыша Сталіна Указы Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР аб прысваенні звання Героя Соцыялістычнай Працы і ўзнагароджанні ордэнамі і медалямі перадавікоў сельскай гаспадаркі. Яны мабілізуюць шырокія масы калгаснікаў на выкананне і перавыкананне дзяржаўных планаў развіцця калгаснай вытворчасці.

У рэспубліцы за атрыманне высокіх ураджаяў і павышэнне прадуктыўнасці грамадскай жывёлагадоўлі ўзнагароджана звыш 3000 перадавікоў сельскай гаспадаркі ордэнамі і медалямі Саюза ССР, а 41 чалавек удастоен высокага звання Героя Соцыялістычнай Працы.

Ніколі яшчэ спаборніцтва ў вёсцы не набывала такога шырокага размаху, як цяпер. У сельскай гаспадарцы, як і ў прамысловасці, адбываецца пераход ад рэкордаў адзіночак да высокапрадукцыйнай работы брыгад, калгасаў і цэлых раёнаў, да атрымання высокіх ураджаяў на вялікіх плошчах.

Магутны ўздым соцыялістычнага спаборніцтва ў вёсцы знайшоў яркае выражэнне ў калектыўных пісьмах да таварыша Сталіна, у складанні і абмеркаванні якіх прымаюць удзел дзесяткі мільёнаў калгаснікаў, работнікаў МТС і соўгасаў. У гэтых пісьмах совецкае сялянства бярэ абавязацельствы дабіцца высокіх і ўстойлівых ураджаяў усіх культур і высокай прадуктыўнасці жывёлагадоўлі, укараняць і асвайваць травапольную сістэму земляробства, найлепшым чынам выконваць абавязацельствы калгасаў і соўгасаў перад дзяржавай.

Велізарная роля ў шырокім разгортванні соцыялістычнага спаборніцтва на сяле належыць сельскім Советам. Многія сельскія Советы рэспублікі ў 1951 годзе, на аснове разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва, дабіліся значных поспехаў у гаспадарчым і культурным будаўніцтве. Яны пачалі аказваць вялікую дапамогу калгасам у іх арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні, ва ўздыме ўраджайнасці і грамадскай жывёлагадоўлі, лепш накіроўваць дзейнасць сельскіх і культурна-бытавых устаноў, шырэй ажыццяўляць мерапрыемствы па добраўпарадкаванню населеных пунктаў.

Адным з сельскіх Советаў, які добра арганізаваў соцыялістычнае спаборнітва і на аснове гэтага дабіўся буйных поспехаў у гаспадарчым і культурным будаўніцтве ў 1951 годзе, з'яўляецца Паселіцкі сельскі Совет Хойніцкага раёна Палескай вобласці (старшыня тав. Губскі Б. В.).

Гэта адзін з буйных сельскіх Советаў Палескай вобласці. На яго тэрыторыі ёсць два ўзбуйненыя калгасы, якія аб'ядноўваюць 1045 гаспадарак, сярэдняя, 2 сямігадовыя і 4 пачатковыя школы, фельчарска-акушорскі пункт, зоаветпункт, калгасныя клубы, хата-чытальня, 4 бібліятэкі, стацыянарная кіно-устаноўка, дзве электрастанцыі і т. д.

Паселіцкі сельскі Совет у 1951 годзе ўзяў на сябе канкрэтныя соцыялістычныя абавязацельствы і ўсю сваю работу будаваў такім чынам, каб забяспечыць іх безумоўнае выкананне. Вынікі прайшоўшага года паказалі, што Паселіцкі сельскі Совет пад кіраўніцтвам і пры дапамозе тэрытарыяльнай і калгасных пярвічных партыйных арганізацый паспяхова выканаў узятыя на сябе абавязацельствы.

З'яўляючыся передавым сельскім Советам рэспублікі, Паселіцкі сельсовет і ў 1952 годзе высока трымае сцяг соцыялістычнага спаборніцтва.

Шырока разгарнуўшы соцыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі, брыгадамі і калгаснікамі, сельскі Совет у 1951 г. забяспечыў паспяховае правядзенне ўсяго комплекса сельскагаспадарчых работ і пры неспрыяльных умовах надвор'я дабіўся атрымання высокіх ураджаяў усіх сельскагаспадарчых культур. Сярэдняя ўраджайнасць зерневых культур

па калгасах сельскага Совета склала 10,1 цэнтнера з гектара. Калгасы і калгаснікі датэрмінова выканалі свае абавязацельствы па пастаўках сельскагаспадарчых прадуктаў дзяржаве, поўнасцю забяспечылі сябе высокаякасным насеннем для сяўбы ў 1952 годзе.

Многае зроблена сельскім Советам ў справе развіцця грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах і павышэння яе прадуктыўнасці. Трохгадовы план развіцця грамадскай жывёлагадоўлі выканан па ўсіх відах жывёлы і птушкі, а таксама па матачнаму пагалоўю. Уся грамадская жывёла размешчана ў добрых, тыповых памяшканнях і поўнасцю была забяспечана кармамі на ўвесь стойлавы перыяд.

У сельскім Совеце добра пастаўлена масава-палітычная і культурна-асветная работа. У правядзенні гэтай работы разам з комуністамі актыўны ўдзел прымае сельская інтэлігенцыя — настаўнікі, аграномы, медыцынскія работнікі, комсамольцы, калгасны актыў. Сіламі сельскага лекторыя ў 1951 годзе прачытана 280 лекцый і дакладаў на палітычныя, сельскагаспадарчыя і прыродазнаўча-навуковыя тэмы.

Пры хаце-чытальні і клубах добра арганізавана гурткавая работа. У 5 гуртках мастацкай самадзейнасці прымае ўдзел 110 чалавек, праведзена 37 масавых вечароў з паказам мастацкай самадзейнасці.

Вялікую работу праводзяць сельская і калгасная бібліятэкі, у якіх налічваецца 6000 экземпляраў кніг. Бібліятэкі абслугоўваюць 1800 пастаянных чытачоў. З чытачамі рэгулярна праводзяцца канферэнцыі, літаратурныя вечары, літаратурныя агляды і т. д.

Сур'ёзную ўвагу сельскі Совет удзяляе пытанню кіноабслугоўвання насельніцтва. У калгасных клубах сістэматычна дэманструюцца навейшыя кінофільмы. У 1951 годзе насельніцтву паказана 127 кінокарцін. Значная работа праароблена па радыёфікацыі населеных пунктаў. У калгасах пабудаваны і працуюць два радыёвузлы, 900 сялянскіх гаспадарак выпісваюць газеты і журналы.

У калгасах і брыгадах рэгулярна выпускаюцца насценныя газеты і баявыя лісткі, у якіх папулярызуюцца лепшыя людзі калгаснай вытворчасці і іх перадавы вопыт работы, а таксама шырока асвятляецца ход социялістычнага спаборніцтва.

Поспехі Паселіцкага сельскага Совета ў гаспадарчым і культурным будаўніцтве дасягнуты на аснове добрай пастаноўкі арганізацыйна-масавай работы Совета, павышэння яго арганізуючай і кіруючай ролі на сяле.

У работу сельскага Совета ўцягнуты ўсе дэпутаты і шырокі актыў. Рэгулярна праводзяцца сесіі Совета, на якіх разглядаюцца важнейшыя пытанні гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. У падрыхтоўцы гэтых пытанняў актыўны ўдзел прымаюць пастаянныя камісіі і дэпутаты Совета.

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*